**Білет 20**

**Практычнае заданне.**
**Развіццё культуры на беларускіх землях у XIV–XVIII стст.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Калі ў Слуцку пачалася вытворчасць знакамітых «слуцкіх паясоў”?
2. Што ў XVII у. спрыяла развіццю навуковых ведаў, а што абмяжоўвала іх развіццё?
3. Якія змены ў сістэме адукацыі, уведзеныя Эдукацыйнай камісіяй, былі, на ваш погляд, найважнейшымі? Назавіце тры з іх. Сваё меркаванне растлумачце.
4. Якія культурныя дасягненні XIV–XVIII стст. з'яўляюцца прадметам гонару сучасных беларусаў? Чаму?

**I. Уклад ураджэнцаў беларускіх зямель у развіццё навукі. XVII стагоддзе** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі. XVI-XVIII стст. 7 клас»)***.**

У XVII ст. навука развівалася дзякуючы захопленасці асобных вучоных. Сярод навукоўцаў - ураджэнцаў беларускіх земляў варта адзначыць ваеннага інжынера Казіміра Семяновіча. Пасля заканчэння Віленскай акадэміі ён служыў у войску ВКЛ. Па загадзе караля таленавіты інжынер быў адпраўлены ў Нідэрланды для далейшага навучання. На падставе матэматычных законаў і ведаў, атрыманых дасведчаным шляхам, ён стварыў кнігу "Вялікае мастацтва артылерыі". У ёй упершыню ў свеце быў прадстаўлены праект шматступеннай ракеты. Выдадзеная ў 1650 г. у Амстэрдаме кніга на працягу двух стагоддзяў служыла падручнікам па артылерыі для ўсёй Еўропы.

Распаўсюджванню навуковых ведаў садзейнічала кнігавыдавецкая і асветніцкая дзейнасць Ільі Капіевіча. Ён быў навучэнцам і выкладчыкам Слуцкай гімназіі. У канцы XVII ст. пераехаў у Амстэрдам і пачаў выдаваць падручнікі на рускай мове. Ім быў распрацаваны новы шрыфт, які стаў асновай усіх сучасных кірылічных шрыфтоў. Па запрашэнні Пятра I асветнік пераехаў у Маскву, дзе пераклаў і выдаў больш за 20 падручнікаў па граматыцы і іншым прадметам.

У канцы XVII ст. з'явіліся ідэі, што ісціна патрабуе доказаў, а не веры. Найбольш яскрава такія погляды праявіліся ў філасофскай сістэме Казіміра Лышчынскага. У сваім маёнтку ён заснаваў уласную школу, вучыў дзяцей шляхты і сялян пісаць, лічыць, замежным мовам і асновам навук. У выкладанні Лышчынскі свядома адмовіўся ад навучання па “Катэхізісе” і даваў дзецям веды аб прыродзе і законах, па якіх яна развіваецца. У сваім трактаце “Аб неіснаванні Бога” Лышчынскі разглядаў рэлігію як інструмент, які дазваляе трымаць чалавека ў страху, а Бога лічыў выдумкай. Філасаф сцвярджаў, што ў аснове ўсяго ляжыць не Боская воля, а законы прыроды. Царкоўны суд аб'явіў Лышчынскага бязбожнікам і прыгаварыў да спалення.

**II. Аб дзейнасці Эдукацыйнай камісіі (***па матэрыялах вучэбнага дапаможніка “Гісторыя Беларусі. XVI-XVIII стст. 7 клас»)*

У XVIII ст. адбыліся вялікія змены ў сістэме адукацыі. У 1773 г. была створана Эдукацыйная камісія, задачай якой было вызваліць школу ад рэлігійнага ўплыву, зрабіць яе свецкай і дзяржаўнай.

Эдукацыйная камісія зацвердзіла адзіную для ўсіх школ праграму навучання. Галоўнае месца ў ёй адводзілася грамадскім і прыродазнаўчым навукам, замежным мовам. Рэлігійныя прадметы выключаліся з праграмы. Былі створаны новыя падручнікі, у першую чаргу па гісторыі і філасофіі. Замест зазубрывання тэкстаў на памяць ставілася задача навучыць навучэнцаў разважаць. Шмат увагі стала надавацца фізічнаму выхаванню і развіццю практычных навыкаў навучэнцаў (напрыклад, у галіне земляробства, аховы здароўя). Асноўным прынцыпам навучання стала яго даступнасць для прадстаўнікоў усіх саслоўяў.

У краіне ствараліся школы трох ступеняў: пачатковыя, сярэднія і вышэйшая. Вышэйшай стала пераўтвораная з Віленскай акадэміі Галоўная школа ВКЛ (пазней Віленскі ўніверсітэт).

Характэрнай рысай гэтага часу стала адкрыццё прафесійных школ. У 1770-я гг. у Гародні і Паставах па ініцыятыве А.Тызенгаўза былі арганізаваны вышэйшая медыцынская, акушэрская, ветэрынарная, чарцёжная і школа малявання. У Гародні пры медыцынскай школе існавалі бальніца, заалагічны сад, анатамічны кабінет.

**III. Слуцкія паясы (***па матэрыялах сайта Belarus.by***).**



Знакамітыя слуцкія паясы – адна з нацыянальных рэліквій беларусаў, узор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які стаў не толькі гістарычным культурным сімвалам, але і сучасным брэндам Беларусі.

Ва ўборы магнатаў у XVI–XVII ст. пояс быў сімвалам прыналежнасці да эліты. Дарагія паясы для шляхты прывозілі з усходніх краін.

У XVIII ст. беларускія ткачы стварылі свае непаўторныя ўзоры і сімвалічныя матывы, эксклюзіўную тэхналогію. Сусветную вядомасць набылі паясы Слуцкай персіярні – мануфактуры, якая належала дынастыі Радзівілаў. Першая персіярня ўзнікла ў Нясвіжы, але ў 1750-я гады яе перанеслі ў Слуцк. У часы росквіту ў Слуцку працавала да 55 ткачоў. На 20-25 станках штогод выпускалі каля 200 паясоў.

З 2012 года ў Беларусі па даручэнні Кіраўніка дзяржавы адроджаны традыцыі вырабу слуцкіх паясоў. У Слуцку вырабляюцца копіі, аналагі слуцкіх паясоў, сувеніры з іх матывамі (мастацкія пано, аксэсуары для кніг, тэлефонаў, ключоў). На прадпрыемстве "Слуцкія паясы" створаны ўнікальны музей, дзе можна ўбачыць сучасныя паясы, паназіраць, як ткачы ствараюць гэтыя шэдэўры, набыць сувеніры.